# ВЫКАРЫСТОЎВАННЕ КЛАСТЭРНАГА МЕТАДУ НА ЎРОКУ «МАЯ РАДЗІМА – БЕЛАРУСЬ»

*І.М. Гладкая, М.А. Валушка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Сёння ў сучаснай школе, нельга ўявіць ўрок без прымянення сродкаў візуалізацыі. Такі падыход да правядзення урока мае свае плюсы: разнастайнасць і павышэнне цікавасці самога працэсу адукацыі, скарачэнне часу для тлумачэння вялікай колькасці матэрыялу [1].

Прымяненне інструментаў візуалізацыі на ўроку «Мая Радзіма – Беларусь» дазваляе павысіць патэнцыял заняткаў. Вывучаючы курс «Мая Радзіма – Беларусь», нельга ўявіць урок без выкарыстання візуалізацыі, бо настаўнік сутыкаецца з тым, што не можа прадэманстраваць навучэнцам важныя моманты гісторыі ў першапачатковым выглядзе.

Таму настаўніку важна выкарыстоўваць разнастайныя сродкі візуалізацыі (карціны з гістарычнымі асобамі, ілюстрацыі ў навучальным дапаможніку, карты ў атласе і інш.).

Адным з цікавых інструментаў візуалізацыі з’яўляецца кластарны метад, які выкарыстоўвае настаўнік на ўроку «Мая Радзіма – Беларусь».

Мэта работы – разгледзець выкарыстанне кластэрнага метаду ў працэсе навучання на ўроках «Мая Радзіма – Беларусь».

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі рэлевантныя тэме навуковыя публікацыі. Выкарыстоўваліся наступныя метады: тэарэтычнага аналізу і сістэматызацыі навуковай літаратуры, апісальны метад.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Метад кластара зручны тым, што можа прымяняцца на ўсіх этапах урока (вывучэнне новай тэмы, замацавання вывучанага матэрыялу, паўтарэння і кантролю). Праз графічнае прадстаўленне інфармацыі кластар дапамагае сістэматызаваць і абагульніць вывучаемы матэрыял [2].

На ўроку кластар выступае як адзін з метадаў развіцця крытычнага мыслення, інтэлектуальных здольнасцяў і ўменняў навучэнцаў, прымаць абгрунтаваныя рашэнні, працаваць з велізарным патокам інфармацыі, аналізаваць розныя бакі разгляданых працэсаў і з'яў.

Праца з кластарам як вядучым прыёмам магчыма на любой стадыі ўрока, напрыклад:

У пачатку занятка навучэнцы сістэматызуюць веды, якія былі атрыманы раней. Далей знаёмячыся з новай тэмай, чытаючы параграф, паступова, у выніку абдумвання прачытанага ў складзены кластар, дадаюцца новыя дадзеныя, што вядзе да структуравання матэрыялу. Пры дадзенай працы, дадаючы новыя элементы ў кластар, магчыма вылучэнне іх колерамі.

Да канца ўрока, пры ўмове існавання гатовага кластару, на этапе рэфлексіі сістэматыруюць тыя веды, што атрымалі. Гэта дапамагае дзецям зрабіць выснову. Калі тэма вялікая (разлічана на 2 і больш урока), то кластар можа дапаўняцца новымі дадзенымі.

У выніку, адзначым, што прымяненне кластара на ўроку дапамагае фарміраваць у навучэнцаў здольнасць бачыць і вылучаць галоўнае ў тэксце, аналізаваць інфармацыю.

Метад складання кластара актуальны на ўсіх уроках, і што самае галоўнае магчыма яго прымяненне на любой тэме. Прыклад выкарыстання кластара на ўроку «Мая Радзіма – Беларусь» пры вывучэнні тэмы «Нашы продкі» прадстаўлен на малюнку 1.




Малюнак 1 – Кластэр

У працэсе работы ад навучэнцаў патрабуецца:

1) прачытаць тэкст, вылучыць асноўныя паняцці;
2) пазначыць сэнсавыя блокі, ўпісаць назвы;
3) прагаворваючы інфармацыю, атрыманую з падручніка, дапоўніць кластар;
4) паказаць сэнсавыя сувязі паміж кампанентамі кластара [2].

Разгледзеўшы прыклад складання кластара, можна адзначыць, што выкарыстоўваючы дадзены інструмент візуалізацыі магчыма павысіць актыўную працу класа. Таксама ў працэсе складання кластара навучэнцы будуць выказваць сваё меркаванне, змогуць праводзіць аналогіі. Што спрыяе развіццю крытычнага мыслення дзяцей, выхаванню творчых патэнцыялаў.

**Заключэнне.** Важна адзначыць, што эфектыўнасць выкарыстання сродкаў візуалізацыі ўзрастае ў выпадку яе выкарыстання з іншымі метадамі. Пры падрыхтоўцы ўрока важна ўлічваць такія дадзеныя, як: індывідуальныя асаблівасці, узрост і магчымасці класа (кожнага навучэнца), матэрыяльная аснашчанасць класнага кабінета (школы), мэта ўрока, асаблівасць вывучаемага прадмета.

Не варта прапускаць той факт, што візуальныя сродкі навучання валодаюць і выхаваўчымі ўласцівасцямі. Калі настаўнік навучыцца правільна ўжываць сродкі візуалізацыі, то ён зможа матываваць дзяцей да вучэння.


1. Зелова, Л. Н. Визуализация обучения как средство развития учебных способностей в начальной школе / Л. Н. Зелова. – Москва : Решение, 2016. – 245 с.

2. Никитина, А. В. Кластер как одна из форм познавательной деятельности обучающихся / А. В. Никитина // Молодой ученый. – 2017. – № 17. – С. 20–31.

3. Крицкая, Н. В. Визуализация как средство активизации познавательной деятельности обучающихся на первой ступени общего среднего образования / Н. В. Крицкая, И. Н. Гладкая // Актуальные вопросы педагогического образования [Электронный ресурс]: монография. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2024. – С. 130-148. https://rep.vsu.by/handle/123456789/42737


## КУЛЬТУРА ЧТЕНИЯ КАК ЧАСТЬ КУЛЬТУРЫ ОБУЧАЮЩЕГОСЯ


*Н.В. Крицкая*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Чтение представляет собой определенный вид речевой практики, отражающий совокупность определенных процедур взаимодействия с письменным текстом в рамках извлечения из него информации и восприятия текста в целом. Формирование культуры чтения происходит на первой ступени общего среднего образования. На современном